*Евіч.*

Львів. Бібліотека
АН. УРСР

# Партызанка.

Цана 20 грош.

1925.
Выдавецтво „Сел. Волі“.
Druk. F. Rubinsztejna, Baranowicze.

T.3(2Б3)6

Starostwo [illegible]
EGZEMPLARZ OBOWIĄZKOWY
Gazeta „[illegible]" egz. 1000
dnia 15. VI 1925 r.

Львівська державна
наукова бібліотека
№ 7103

13.270

# ПАРТЫЗАНКА.

## I.

У беларускім незалежніцкім руху, пасьля сусьветнае вайны і рэвалюцыі у Расеі, пачаткам зарганізаваньня і дзейнасьці беларускіх партызанау, трэба лічыць урэмя заключэньня паміж Польшчай і Саветамі рыжскага трактату, па катораму Беларусь, як адзінае жывое цела, аказалося разрэзанай на две паловы, з чым, разумеецца, больш сьвядомы і актыуны беларускі элемэнт ніяк ня мог згадзіцца. Яго складалі пераважна быушыя вайсковыя—ахвіцэры і жаунеры беларускай нацыянальнасьці. Імкненьнем было: аружжам, пры помачы меушага выбухнуць паустаньня беларускага народу проці маскоускіх камуністау, заняць сталіцу Беларусі—Менск, каб уладаючы сэрцам Беларусі—сталіцаю—мець магчымасьць залажыць моцныя падваліны пад далейшае істнаваньне незалежнай беларускай дзяржавы.

Рух гэты, пасьля зліквідаваньня праз Польшчу ахвотніцкіх аддзелау Булак-Балаховіча і іншых вайсковых адзінак, на беларускай тэрыторыі, занятай праз камуністычнае войска і камуністычную інтэрнацыянальную уладу паустау сам па сабе і штодня пашырауся, так што у хуткім часе ахапіу амаль што не усю акупіраваную праз бальшавікоу тэрыторыю Беларусі, прыцягнуушы да сябе шырокія сялянскія масы.

Гора было камуністым, іхнім сымпатыкам і камісарам, каторыя траплялі у рукі беларускіх партызанау: ніякае жальбы—сьмерць і годзі.

Сялянству у сваей значнай большасьці гэткая дзейнасьць іхніх лепшых сыноу, стаяушых на чале партызанскіх аддзелау, надта спадабалася. Помач і сымпатыя была аказана зусім выразная. А гэта тлумачыцца тым, што беларускі

селянін па псіхалёгіі—уласьнік, ніяк ня можа гадзіцца з адменай праз камуністау уласнасьці яго на зямлю і іншае. А што гэта верна і неадменна, аб гэтым сьведчыць факт прызнаньня праз радавую камуністычную уладу уласнасьці на зямлю выключна толькі у радавай Беларусі. Прауда, улада гэтага прынцыпу трымаецца больш на паперы, чым на дзеле, але за тое мае і цяпер бяду з усё вазрастаючым нездаваленьнем народу, нават вядзе вайну з паасобнымі дробнымі аддзеламі паустанцау—тамашніх беларусау, весткі аб чым бываюць у радавых-жа газэтах.

Чым-жа скончыуся пэршы аружны пратэст беларусау проці заняцьця беларускай тэрыторыі праз антынацыянальную уладу—камуністычную?

Гэтая улада, прадбачучы далейшы узрост нездаваленьня беларускага народу, а нямаючы значнае лічбы сымпатыкау камунізму з пасярод беларускага грамадзянства, мусіла абаперці сваю уладу на мяйсцовым жыдоускім элемэнце, значная прысутнасьць каторага на адказных службовых станавішчах у радавай Беларусі ішчэ больш пагоршыла палажэньне і ня столькі камуністычнае улады, сколькі жыдоускага грамадзянства пад гэтай уладай, бо партызаны усю сваю злосьць зьвярнулі тады у кірунку разьні ні у чым непавінных жыдоу—бяз розніцы веку, полу, праконаньняу і зьніштажэньня іх дабрабыту, падставы жыцьця у вёсках, мястэчках і паветовых гарадах, рабуючы іхняе дабро або пускаючы усё з дымам пажару у паветра.

І з гэтага моманту партызанка траціць свой ідэйны характар.

Кроу і рабункі. Рабункі і кроу. Бальніцы перапоунены калекамі...

Сьлёзы, сьлёзы і сьлёзы не у чым нявінных жыдоу. .

Гэта з аднаго боку. А з другога? Вастрогі,

суды, растрэлы лепшых беларускіх жыхароу, часьцей зусім нявінных, або канфіскацыя іхняе маёмасьці, паленьне праз карныя аддзелы вёсак і гэтак далей.

Вось рэзультат тагочаснае партызанкі,

А сколькі лепшых сыноу беларускага народу змушана было эміграваць, уцячы заграніцу, каб і там бядаваць, а праз нейкі час ужо паверыць бальшавіцкім маніфэстам і выехаць да дому, да бацькоу пад уладай Радавае Беларусі?

Хто-ж з іх не памыліуся, дык вельмі нязначная частка, бо большасьць з вярнуушыхся, па уплыве таго ці іншага урэмя усёж-ткі... вывядзены у разход...

Гэткім ашуканствам камуністы пазбыліся страшнейшых сваіх варагау...

А беларускі народ? Найлепшых сваіх сыноу, каторых змарнавалося некалькі тысячоу...

Змарновалося без неякае карысьці!..,

Прауда, камуністы былі праз партызанау змушаны абвесьціць нейкую такую Беларусь, але на свой камуністычны капыл, ня мілы зусім для беларусау,

Ды і гэта бальшавікі зрабілі больш дзеля таго, каб мець магчымасьць пашыраць свае уплывы сярод беларусау, што пад Польшчаю, а праз іх здабываць уплывы і сярод польскага народу, каторы, як больш культурны ад беларусау і палітычна сьвядомы, не надта то латва чапляецца на вудачку камуністау.

А трэба ведаць, што каліб бальшавікам удалося заўладаць польскім народам, дык тады аб беларускім народзе не было-б і мовы.

Тады круціліб да немцау, ангельцау, чэхау і іншых, пакуль-бы самі ня згінулі, бо усе гэтыя народы маюць дауно усе правы і свабоды ужо на дзеле, а бальшавікі,.. толкі на паперы.

І эканамічна яны стаяць зусім іначай, чым расейцы, беларусы і іншыя, папаушыя пад уладу камуністау.

Вось з гэтым і трэба лічыцца беларускаму народу у сваей нядолі. Бо астацца без лепшых сыноу ня трудна...

Адных растраляюць, другіх навернуць на свой інтэрнацыянальны камуністычны капыл... А дзе-ж тады шукаць нацыяналістау беларусау? Хто-ж тады будзе будаунічым нашае будучыні?

## II.

Другая партызанка так званая літоуска-беларуская узяла свой пачатак з Літвы у канцы **1921** г. і найбольшую дзейнасьць праявіла у 1922 калі спрэчкі з-за Віленшчыны і часткі Гарадзеншчыны паміж Літвой і Польшчай прынялі зусім востры характар.

У інтэрэсах Літвы было, каб так ці інакш прыцягнуць да сябе сымпатыі беларускага народу, знаходзячага пад уладаю Польшчы, што жыве на тэрыторыях, аб каторых йшоу торг паміж Польшчай і Літвой.

Літва у сваіх дзяржауных інтэрэсах мусіла надаваць беларускім правадырам усякіх абецанак, абы толькі пры дапамозе беларусау выіграць справу Вільні, а таксама падбухторывала беларускую моладзь ісьці у партызанку, каб вясьці супольную барацьбу нібы за вызваленьне і свае правы...

Грошау такжа не шкадавала.

Да таго-ж і у самым Коуне беларускае жыцьце кіпела ува усю.

Шчырыя хаурусьнікі ды і годзі!

І большасьць беларускіх дзеячоу, а за імі і моладзь загарэліся сымпатыямі да Літвы.

Хлапцы пацягнуліся да партызанкі заграніцу, у Літву. Там нейкія голасныя штабы, камітэты і так далей.

Колькі сьветлых падзей!

То там то сям нешта пробавалося утварыць, нешта выканаць, зрабіць... Але няшчырасьць, правакацыя, ды і голая, колькі яе ня маніліся-б нечым прыкрыць...

Гэтак выйшло і з пачынаньняу літоуска-беларускіх, у каторых Літва іграла роль ашуканца. А калі яна нічога ад Польшчы не утаргавала, дык бяз усякіх цэрэмоній ня толькі зліквідавала штабы і аддзелы партызанау, але і забараніла шырэйшую культурную беларускую працу у Літве.

Галодныя і абдзёртыя беларусы-партызане распаузліся ува усе бакі сьвета, часта пад прасьледаваньнем літоускае дэфэнзывы, каторая раней усім-жа і кіравала.

Павароту да дому няма. І ізноу вастрогі, суды, кары.

Што-ж рабіць? Каму верыць?

І ці-ж можна было нешта рэальнае зрабіць праз дзейнасьць так дзіцячае партызанкі, меушай зусім наіуныя праекты і падзеі?

Дух разбіты. Людзі выкінуты заграніцу або сядзяць у вастрогах, духоунае цярпеньне каторых цяпер трэба бачыць, адчуць, каб пашкадаваць, што гэтак сталося, што ня было каму абразумець гарачыя голавы, неразбіраючыяся у палітычных хітрыках і правакацыі.

## III.

І вось цяперка на тэрыторыі Заходняй Беларусі мы бачым праявы новае правакацыі-гэта напады на цягнікі і рабункі Богу-душой нявінных пасажырау.

Спалохаць, раздзець да гала безаружных людзей, забраць можа апошнія у іх грошы, каторыя крывым мазолям або у бязсонныя ночы зароблены, зрабаваць вопратку, боты, паперы,

астауляючы пасажырау у дарозе у аднэй толькі бялізне-ці-ж гэта не дзералупства, аб якім нявeдала йшчэ наша мнагапакутная старонка? ці-ж гэта ня насьмешка над асобай, над чалавекам, над усім тым, што здауна лічыцца сьвятым? ці-ж гэта ня дзяцінства тых, каторыя, робячы гэткія рэчы, йшчэ маюць дауціп падавацца за нейкі беларуска-украінскі хаурус, г. е. за нешта ідэйнае? ці-ж гэта ня ёсьць спроба справакаваньня нацыянальнага беларускага руху у Польшчы? ці-ж у гэтым ня відаць кастлявае рукі нейкае лэфэнзывы, ці Чэкі-усё роуна?!

Беларускі селянін, ведома, сам ня пойдзе на шлях з вялізарным нажом, дык яго цягнуць туды розныя правакатары і заграчічныя шпіёны для натуральнага рабунку і здабыцьця дакумэнтау, але пад лёзунгам пакрыуджаных беларусау.

Каму яно патрэбна-гэтае ашуканство, гэтыя сьлёзы нявінных селян, каторых за нішто цягаюць на дапросы, у вастрогі і гэтак далей?.

Чым-жа апраудаць насьмешку, зьдзек над пасажырамі...

Рабунак заусёды мае назву рабунка, ці, як цяпер кажуць, бандытызма,

І нам, беларусам-нацыяналістам, як-раз балюча тое, што за праступныя адзінкі, ідучыя на повадну ворагау, назва-бандыты лучыцца з назваю-беларусы.

Гэткім чынам, гэткім шляхам ідучы, трэба ведаць нам, мы ніколі не дойдзімо да лепшае будучыні.

Актыунейшых з пасярод нас справакуюць, лепшых вылавяць, скампрамітуюць... А што далей?

Вось аб чым трэба помніць і ні на якія улоукі ворогау не ісьці.

Бо гэткімі выбрыкамі дзела не паправіш, а толькі папсуеш.

Гэта на руку ворагам...

Што камуністу бяздомнаму, антынацыянальнаму здорава, тое беларусу, вядучаму барацьбу ужо колькі вякоу за сваю Бацькаушчыну, шкодна.

Беларускі народ у першай чарзе мусіць зьвярнуць сваю увагу на культуру, на эканоміку, на усё тое, што магчыма і карысна, а не пацешацца з глупстваў гультаёў, каторыя выдумываюць розныя ідэі толькі дзеля таго, каб на чужы кошт жыць, як гэта зрабілі у Расеі, каб захапіць у свае рукі уладу камуністы, абецаючы і зямлю, і волю, і і усё, але не далі амаль нічога.

Замест надзяленьня зямлёй з казённых і памешчычых, як крычалі самі, маёнткау, разбіцьця зямлі на хутары, падняцьця зямельнае культуры, лепшае управы, адменілі уласнасьць і на тую зямлю, якую селяне мелі і пры царэ. А калі хто з селянау і захапіу больш зямлі, дык той-жа самай селянскай, бо з маёнткау карыстаюць толькі камісары, іхнія сямейства і парабкі, каторыя мелішчасьця на ёй працаваць.

Прауда, некалькі маёнткау у Радавай Беларусі атрымалі і жыхары, але тыя з быушых мястовых жыхароу-гандляроу, жыдоу, каторым дзякуючы бальшавіцкае палітыцы, няма чаго рабіць у горадзе. А домагаушыяся зямлі селяне-беларусы атрымалі яе, але... у Сібіры.

Калі бальшавікі, каб пазбыць селян зямлі ува усей Расеі адменілі уласнасьць на зямлю, дык беларускі народ як па псіхалёгіі народ-уласьнік запратэставау проці гэтага і бальшавікі, маючы з боку Польшчу, спалохаліся і хоць на паперы ды адменілі свае правы на зямлю, Разумеецца, толькі на нейкі час.

І калі народ, жывучы пад Польшчаю кажэць, што ён шмат чаго мець хоча, дык і народ, жывучы пад камуністамі, ужо зусім стогнець ад іхняе палітыкі ды больш церпіць у гаспадарчым жыцьці і марыць, як-бы далучыцца да Польшчы абы

ня быць пад бальшавікамі.

Камуна не для беларусаў.

Гэтага ня трэба і даказываць.

Селяне самі аб гэтым добра ведаюць.

Вось камуністы ў агітацыі і ў нас відаць маюць нейкія парахункі, дык дзеля гэтага выкарыстовываюць беларусаў.

На сваей-жа тэрыторыі также маюць процi сябе партызанаў, каторых для вылаўліваньня самі-ж і арганзуюць.

Але хто ня хоча шкодзіць сабе, свайму народу, той мусіць ад усякіх камбінацыяў і хітрыкаў адкрэшчывацца як ад чорта.

У гэтым наш ратунак. У гэтым падзеі нашай лепшае будучыні.

Дык тады, што-ж нам дала трецьця партызанка?

Кроў і сьлёзы, Толкі!

Ды і Эўропа глядзіць на нас, як на некультурны народ, як на бандытаў, дзікароў, а дзеля гэтага зусім і ня цікавіцца намі, нашай будучыняю.

А пры гэткіх адносінах крычаць нам аб нашых крыўдах і балячках-усё роўна што гарохам прабіваць мур.

Вось якія рэзультаты партызанак...

13. 2770
Львів. Бібліотека
АН. УРСР
Львівська державна
наукова бібліотека
№ 7103

Жуткоо - Rozt...
0,24 (1987)
РЛ 7103 У
06
10

Евіч.

Львів. Бібліотека
АН. УРСР

# Партызанка.

Цана 20 грош.

1925.
Выдавецтво „Сел. Волі“.
Druk. F. Rubinsztejna, Baranowicze.